УДК 37.012

# АСАБЛІВАСЦІ ДЗЕЙНАСЦІ ПЕДАГОГА Ў ПРАЦЭСЕ АРГАНІЗАЦЫІ ДЫЯГНОСТЫКІ ДАСЯГНЕННЯЎ НАВУЧЭНЦАЎ

**Савіцкая І. У., канд. філал. навук, дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле раскрываецца сутнасць педагагічнай дыягностыкі ў сістэме работы педагога, вызначаны яе функцыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, а таксама прынцыпы арганізацыі.
Ключавыя словы: вучэбна-выхаваўчы працэс, педагагічная дыягностыка, педагагічная дзейнасць, прынцыпы дыягнастычнай дзейнасці.

# FEATURES OF THE TEACHER'S ACTIVITY IN THE PROCESS OF ORGANIZING DIAGNOSTICS OF STUDENT ACHIEVE-MENTS

**Savitskaya I. V., associate professor**
*Belarusian National Technological University*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: тhe article reveals the essence of pedagogical diagnostics in the teacher's work system, defines its functions in the educational process, as well as the principles of organization
Keywords: educational process, pedagogical diagnostics, pedagogical activity, principles of diagnostic activity.

Педагог – куратар вучэбнай групы ў вышэйшай навучальнай установе або класны кіраўнік у школе – з’яўляецца пэўным чынам каардынатарам усіх працэсаў, якія так ці інакш аказваюць уплыў на асобу маладога чалавека або на ўвесь калектыў, а таксама сумесных намаганняў іншых выкладчыкаў, псіхолагаў, прадстаўнікоў адміністрацыі, якія працуюць у дадзенай групе.

Патрабаванні да сучаснага педагога дыктуюцца, як сцвярджае М. М. Барытка, узроўнем развіцця сучаснага грамадства, педагагічнай навукай і практыкай [3, с. 14]. На думку даследчыка, куратар (класны кіраўнік) павінен у сваей дзейнасці вырашаць наступныя задачы: 1) стварэнне студэнцкага (вучнеўскага) калектыву, што забяспевае належнае развіцце кожнай асобы; 2) назіранне за індывідуальным развіццем навучэнцаў, а таксама яго карэкцыя (пры неабходнасці), што садзейнічае развіццю здольнасцей кожнай асобы; 3) арганізацыя розных відаў індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці з мэтай прыцягнення навучэнцаў у разнастайныя камунікатыўныя сітуацыі.

Кіруючыся даследаваннямі многіх метадыстаў, мы выдзелілі некалькі функцый педагога-куратара: аналітыка-дыягнастычную, арганізацыйна-каардынацыйную і камунікатыўную. Спынімся падрабязней на кожнай з іх.

Аналітыка-дыягнастычная функцыя ўключае ў сябе вывучэнне і аналіз індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў; вывучэнне і аналіз калектыву навучэнцаў на працягу пэўнага часу; аналіз і ацэнка сямейнага выхавання навучэнцаў; аналіз узроўню выхаванасці канкрэтнай асобы і калектыву ў цэлым. Ад аналітычнай дзейнасці педагога будзе залежаць далейшы характар і змест работы з навучэнцамі і групай.

Наступная функцыя – арганізацыйна-каардынацыйная – уключае ў сябе арганізацыю і правядзенне разнастайных выхаваўчых мерапрыемстваў, якія будуць садзейнічаць развіццю асобы навучэнцаў, а таксама згуртоўваць калектыў; забеспячэнне ўзаемадзеяння куратара з выкладчыкамі розных дысцыплін для рашэння праблем з вучобай; супрацоўніцтва з тымі арганізацыямі, якія дазваляюць павысіць эфектыўнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу (да іх можна аднесці музеі, кінатэатры, тэатры, даследчыя цэнтры і да т. п.); сувязь з органамі маладзежнага самакіравання (студэнцкія і вучнеўскія камітэты, маладзежныя суполкі); арганізацыю суботнікаў, працоўнай практыкі; супрацоўніцтва са спецыялістамі псіхолага-педагагічнай службы з мэтай стварэння спрыяльных умоў для развіцця асобы; вядзенне адпаведнай дакументацыі (журналы куратараў, планы работы і інш.).

Яшчэ адной важнай функцыяй у дзейнасці педагога з’яўляецца камунікатыўная. Яе сутнасць заключаецца, з аднаго боку, у

фарміраванні пазітыўных узаемаадносін паміж навучэнцамі ў калектыве; з другога боку – у фарміраванні ўзаемаразумення ў сістэме «навучэнец – педагог», а таксама ў навучанні маладых людзей усталеўваць станоўчыя адносіны з іншымі людзьмі.

Безумоўна, для педагагічна паспяховага і эфектыўнага выканання сваіх прафесійных абавязкаў куратар павінен добра ведаць псіхолага-педагагічныя прынцыпы работы з навучэнцамі, быць у курсе сучасных спосабаў, формаў і метадаў выхаваўчай дзейнасці. Адсюль мэтай педагагічнай дзейнасці куратара або класнага кіраўніка, на нашу думку, з’яўляецца арганізацыя цэласнага педагагічнага працэсу, а таксама ажыццяўленне яго кіраўніцтва. Напрыклад, куратар у пачатку сваей работы са студэнцкай групай першага курса павінен вывучыць сацыяльна-педагагічныя ўмовы папярэдняга фарміравання і развіцця кожнага навучэнца, а таксама выявіць прычыны і характар негатыўных уплываў, калі такія есць. Затым неабходна будзе распрацаваць праграму псіхолага-педагагічнай карэкцыі выяўленых праблем на пэўны перыяд часу.

Наогул педагагічная дыягностыка і адносіны, якія ўзнікаюць пры яе правядзенні, маюць этычную афарбоўку, паколькі яе ўдзельнікмаі з’яўляюцца рэальныя людзі са сваім светапоглядам, каштоўнасцямі і г. д. Адсюль існуе шэраг этычных прынцыпаў, якімі павінен кіравацца кожны педагог у рабоце з навучэнцамі.

Самым важным і нават вызначальным, на наш погляд, этычным прынцыпам у працэсе правядзення дыягностыкі дасягненняў навучэнцаў з’яўляецца агульнавядомы *прынцып ненанясення шкоды падыспытным*. Згодна з гэтым прынцыпам неабходна арганізаваць сваю дыягнастычную дзейнасць такім чынам, каб яна ні на адным этапе правядзення не наносіла навучэнцам шкоду (напрыклад, іх здароўю, сацыяльнаму становішчу і г. д.). Адсюль падыспытны павінен усведамляць мэты праводзімага даследавання (напрыклад, анкетавання), а таксама дзе і ў якім аб’еме будуць выкарыстаны атрыманыя вынікі. Наогул неабходна спачатку атрымаць дазвол навучэнцаў удзельнічаць у дыягностыцы. Акрамя таго, методыкі, якія выбірае педагог для правядзення абследавання, павінны даваць толькі неабходную інфармацыю пра падыспытнага.

Важным з’яўляецца і *прынцып кампетэнтнасці*, які патрабуе ад педагога старацца вырашаць толькі тыя пытанні і праблемы, па якіх ен прафесійна дасведчаны, а таксама валодае неабходнымі ўменнямі

і навыкамі. Канечне, рэалізуецца гэты прынцып толькі ў цесным супрацоўніцтве педагога і навучэнца, г. зн. важным з'яўляецца павышэнне сваей кваліфікацыі як адносна педагагічнай навукі ў цэлым, так і ў межах уласнай прафесійнай кампетэнтнасці. З падыспытнымі зносіны павінны будавацца, з аднаго боку, на даверы і ўзаемнай сімпатыі, а з другога – дазваляць без шкоды вырашаць усе пастаўленыя задачы.

Пры правядзенні дыягнастычнага даследавання неабходна кіравацца і *прынцыпам бесстароннасці*. Згодна з ім у педагога не павінна быць суб'ектыўных адносін да навучэнца, нягледзячы на тое, якое б ураджанне ен ні рабіў і якая б ні была думка аб ім. Усе дыягнастычныя методыкі павінны быць стандартызаваныя і адпавядаць мэтам даследавання і асаблівасцям падыспытных.

*Прынцып канфедэнцыйнасці,* як вядома, з'яўляецца вельмі актуальным у наш час. Згодна з ім усе матэрыялы, якія былі атрыманы ў выніку правядзення дыягностыкі, не павінны быць вядомы шырокаму колу людзей. Для гэтага доступ да вынікаў дыягностыкі павінен быць абмежаваным.

І наканец, *прынцып дасведчанай згоды*. Менавіта гэты прынцып аб'ядноўвае ў сабе ўсе патрабаванні, якія былі прыведзены намі вышэй; ен рэалізуецца ў разуменні ўсімі ўдзельнікамі дыягностыкі этычных правіл яе правядзення і згоды з імі.

Такім чынам, арганізацыя дыягнастычнай дзейнасці павінна праводзіцца планамерна і сістэматычна, ва ўзаемасувязі ўсіх напрамкаў і складнікаў. Толькі ў такім выпадку педагог зможа стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця асобы і калектыву, а ажыццяўленне працэсу навучання і выхавання будзе праходзіць больш эфектыўна.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Борытко, Н. М. Диагностическая деятельность педагога: учебное пособие / Н. М. Борытко; под ред. В. А. Сластенина, И. А. Колесниковой. – Москва: Академия, 2006. – 284 с.